# КАЛІ СПОРТ ПЕРАТВАРЫЎСЯ Ў ІНСТРУМЕНТ ПАЛІТЫКІ...

## Або быў такі заўсёды?

**На мінулым тыдні ў інфармацыйныя стужкі сусветных сродкаў масавай інфармацыі ўварвалася гучная навіна — Расія адхілена ад удзелу ў зімовых Алімпійскіх гульнях 2018 года. Алімпійскі камітэт гэтай краіны пакараны з-за масавых парушэнняў антыдопінгавых правілаў, але «чыстыя» спартсмены ўсё ж такі змогуць выступіць на Гульнях, праўда, толькі пад нейтральным сцягам. Грамадскасць захліснула маса меркаванняў, заяў, здагадак, шуміха не заканчваецца і сёння.**

У гісторыі алімпійскага руху такое здарылася ўпершыню (каб краіну адхілілі з-за допінгу), хоць усе ведаюць, што выпадкі, калі адразу цэлыя дзяржавы не ўдзельнічалі ў самых маштабных спартыўных спаборніцтвах свету, ужо бывалі, праўда, прычыны тады часцей за ўсё насілі палітычны характар. Сёння ўспамінаем самыя яркія і маштабныя байкоты і скандалы ў гісторыі алімпійскага руху.

* * *

Публічная дэманстрацыя палітычнага пратэсту была ўласціва Алімпійскім гульням фактычна першапачаткова. А вось першы свядома арганізаваны байкот па ініцыятыве Міжнароднага алімпійскага камітэта адбыўся напярэдадні **Алімпіяды ў Антверпене ў 1920 годзе.** Па афіцыйна абвешчаных палітычных матывах — у якасці пакарання за развязванне Першай сусветнай вайны — на Алімпіяду не былі запрошаныя спартсмены Германіі і яе краін-саюзніц. Не было ў Антверпене і спартсменаў з Савецкай Расіі — МАК, несумненна, па палітычных прычынах, не задаволіў заяўку Усевобуча (усеагульнае ваеннае навучанне) аб допуску дэлегацыі на Гульні.

У ходзе падрыхтоўкі да наступных **Алімпійскіх гульняў у Парыжы ў студзені 1924 года** пры пасрэдніцтве Французскага працоўнага спартыўна-гімнастычнага саюза аргкамітэт парыжскай Алімпіяды перадаў у Вышэйшы савет па фізічнай культуры РСФСР афіцыйнае запрашэнне СССР на Гульні. Аднак гэтым разам адмова паступіла ўжо з расійскага боку: РСФСР палічыла непрымальнай падобную — праз пасрэдніка — форму адносін з алімпійскім рухам. Аналагічныя беспаспяховыя спробы прыцягнення савецкіх спартсменаў да ўдзелу ў алімпійскім руху рабіліся з боку некаторых НАКаў і іншых спартыўных арганізацый і пазней — напярэдадні Х Алімпіяды ў Лос-Анджэлесе і Гульняў 1940 года, якія не адбыліся з-за вайны. У выніку савецкі спорт быў прадстаўлены толькі на XV Алімпійскіх гульнях 1952 года ў Хельсінкі.



Томі Сміт і Джон Карлас на п'едэстале гонару пратэстуюць супраць расізму ў ЗША. 1968 год.

* * *

**Алімпійскія гульні ў Мехіка 1968 года** запомніліся студэнцкімі байкотамі. За дзесяць дзён да старту на плошчу Трох Культур выйшлі 15 тысяч чалавек. Асноўным лозунгам дэманстрантаў быў «Мы не хочам Алімпіяды, мы хочам рэвалюцыі!» Улады ўвялі ў сталіцу войскі, правялі масавыя арышты і ўжылі празмерную сілу для разгону натоўпу. Ніякіх санкцый з боку МАК не было, арганізацыя заявіла, што ўсё тое, што адбылося — унутраная справа Мексікі.

Таксама Гульні ў Мехіка адзначыліся байкотамі асобных спартсменаў.

* * *

**Мюнхенская Алімпіяда 1972 года** працягнула сумную эстафету байкотаў: тады на цырымонію ўзнагароджання дэманстратыўна не выйшла зборная ЗША па баскетболе, якая прайграла фінал зборнай СССР. Пасля гульні амерыканская зборная падала афіцыйны пратэст на дзеянні суддзяў (а менавіта: на дададзеныя трох секундаў пасля паўторнага запуску табло, у якія, дарэчы, беларус Іван Ядэшка прынёс «золата» Савецкаму Саюзу).

Цырымонія ўзнагароджання тройчы адкладалася, у выніку каманда СССР атрымала медалі праз суткі пасля матча ў гандбольнай зале і без балельшчыкаў. Сярэбраныя ўзнагароды ЗША цяпер захоўваюцца ў адным з банкаў (па іншых звестках, у галоўным офісе МАК) у Лазане. А капітан баскетбольнай зборнай ЗША Кені Дэвіс нават напісаў у завяшчанні, каб ніхто з нашчадкаў ніколі не згаджаўся на атрыманне гэтага яго медаля.

Акрамя таго, у Мюнхене быў здзейснены тэрарыстычны акт супраць зборнай Ізраіля. Пасля гэтага частка СМІ і грамадскасці стала патрабаваць спыніць Алімпіяду ў знак жалобы па ахвярах тэракта, але МАК прыняў рашэнне, што спыненне Гульняў будзе азначаць перамогу тэрарыстаў і знакам, што ім удалося сарваць Гульні. Таму было вырашана абмежавацца толькі правядзеннем жалобнай цырымоніі ў алімпійскай вёсцы і памінальнай службай на галоўным стадыёне, а ўжо на наступны дзень Алімпійскія гульні працягнуліся.

Сярод 122 сцягоў краін-удзельніц на стадыёне быў прыспушчаны толькі сцяг Ізраіля, а самі ізраільскія алімпійцы, не робячы ніякіх гучных заяў, ноччу пакінулі Германію і вярнуліся дадому. Гульні таксама пакінулі некаторыя спартсмены з Алжыра, Нідэрландаў, Філіпін і ЗША.

* * *

На 80-я гады XX стагоддзя прыйшоўся пік палітычнага супрацьстаяння ў ходзе халоднай вайны, што не проста адбілася на **Алімпіядзе ў Маскве і Лос-Анджэлесе,** гэтыя Гульні адзначыліся самымі гучнымі і шматлікімі байкотамі за ўсю гісторыю алімпійскага руху.

Ідэя байкоту ў знак пратэсту супраць уводу савецкіх войскаў у Афганістан у снежні 1979 года нарадзілася на сустрэчы НАТА. Пазней прэзідэнт ЗША Джымі Картэр выказаўся за прыпыненне сувязяў з СССР і прапанаваў МАК перанесці Алімпіяду ў іншую краіну. МАК адхіліў гэтую ідэю. Дачакаўшыся нармальнага завяршэння гульняў зімовай Алімпіяды ў амерыканскім Лэйк-Плэсідзе, Джымі Картэр выставіў Савецкаму Саюзу ўльтыматум: калі савецкая армія да 20 лютага не пакіне Афганістан, ЗША будуць байкатаваць маючыя адбыцца ў Маскве летнія Гульні. Як вядома, ультыматум быў праігнараваны.

Увогуле маскоўскую Алімпіяду-80 у той ці іншай форме байкатавалі спартсмены з 64 дзяржаў, праўда, пэўная іх частка з эканамічных, а не палітычных прычын, а, напрыклад, Іран, Мазамбік і Катар проста не былі запрошаныя МАК. Урады Вялікабрытаніі, Францыі, Італіі і Іспаніі дазволілі сваім Алімпійскім камітэтам самастойна прымаць рашэнні аб удзеле ў Алімпіядзе. У выніку большасць спартсменаў са згаданых краін на Гульні ўсё ж такі прыехалі ў індывідуальным парадку.

На цырымоніі адкрыцця і закрыцця Алімпіяды 16 зборных ішлі не пад нацыянальнымі сцягамі, а пад алімпійскім. Пры ўручэнні медалёў атлетам з гэтых краін гучалі не нацыянальныя гімны, а алімпійскі гімн.

* * *

**Летнія Алімпійскія гульні 1984 года ў Лос-Анджэлесе** байкатаваліся ўсімі краінамі сацыялістычнага лагера (акрамя Румыніі, Югаславіі і КНР). Афіцыйнай прычынай стала адмова арганізатараў Алімпіяды-84 даць гарантыі бяспекі спартсменам з СССР і іншых краін Варшаўскага пагаднення.

Тагачасны прэзідэнт МАК Хуан Антоніа Самаранч актыўна спрабаваў пераканаць савецкае кіраўніцтва змяніць сваё рашэнне, але не дасягнуў поспеху.

Адначасова з паведамленнем аб рашэнні СССР байкатаваць Гульні было абвешчана аб правядзенні ў дзевяці краінах сацблока міжнародных спаборніцтваў «Дружба-84». Спаборніцтвы праводзіліся па ўсіх алімпійскіх відах спорту, акрамя футбола і сінхроннага плавання, а таксама па трох неалімпійскіх відах — самба, тэніс і настольным тэнісе. У "Дружбе-84" прынялі ўдзел спартсмены больш чым з 50 краін, як тыя, хто байкатаваў Гульні ў Лос-Анджэлесе, так і тыя, хто не выступаў з пратэстам. На турніры было ўсталявана некалькі дзясяткаў сусветных рэкордаў.

У выніку двух узаемных байкотаў Алімпійскіх гульняў з боку СССР і ЗША тагачасным прэзідэнтам МАК Самаранчам былі ўнесены дадатковыя артыкулы аб сур'ёзных санкцыях у дачыненні да НАК краіны, якая паспрабуе выступіць з байкотам. Такі ўчынак можа пагражаць дыскваліфікацыяй адпаведнай зборнай на адну або некалькі будучых Алімпіяд.

* * *

**У Алімпіядзе 2000 года ў Сіднеі** прынялі ўдзел усе члены МАК — за выключэннем Афганістана, які байкатаваў Гульні. Тэакратычны рэжым Талібану забараніў спорт увогуле, ліквідаваў НАК краіны і адхіліў запрашэнне МАК. Прысутнасць спартсменаў-афганцаў стала немагчымая.

### ❍ Да тэмы

**Пад нейтральным сцягам звычайна разумеюць алімпійскі сцяг, які ўпершыню быў узняты на Алімпіядзе-1924 у Антверпене. Сёння ўдзел спартсменаў пад сцягам МАК практыкуецца ў двух выпадках: калі краіна знаходзіцца ў працэсе станаўлення або калі НАК краіны часова выключаны са складу МАК за тыя ці іншыя парушэнні. Па першай прычыне ў Сіднеі-2000 выступілі нейтральныя спартсмены з Усходняга Тымора, у Лондане-2012 — з Паўднёвага Судана і Нідэрландскіх Антыльскіх астравоў. Другая прычына ў розныя гады замінала апрануцца ў нацыянальныя колеры алімпійцам з Кувейта, Эквадора, Індыі і Шры-Ланкі. А на Алімпіядзе-2016 у Рыа-дэ-Жанейра выступіла асобная зборная бежанцаў — таксама пад алімпійскім сцягам.**

■ Еўрагульні. Арэны

# ЗА 50 ГАДОЎ ЁН БАЧЫЎ УСЁ

## Мінскі палац спорту: якім быў у 1966-м і якім будзе ў 2019-м

**Напэўна гэта самы вядомы спартыўны будынак сталіцы, яго ведаюць як дарослыя аматары спорту, так і юныя. На ім запальваліся «зоркі» 50 гадоў таму і запальваюцца сёння. Ён прымаў спаборніцтвы рознага ўзроўню — ад спартакіяд да чэмпіянатаў свету, быў запатрабаваны палову стагоддзя таму, калі з'яўляўся самым буйным спартыўным аб'ектам сталіцы і застаецца папулярны сёння, калі ўжо даўно не з'яўляецца самым маштабным у Мінску.**

Будаўніцтва арэны пачалося ў 1963-м, у адным з самых жывапісных месцаў сталіцы — на беразе Свіслачы, а завяршылася праз тры гады, напярэдадні Дня Перамогі 7 мая 1966-га. Збудаванне па тых часах стала ўнікальным і першым такім у Савецкім Саюзе. Пры яго стварэнні былі ўжытыя новыя будаўнічыя матэрыялы і зроблены арыгінальныя сядзенні з шклапластыку. Пазней дакладна такія ж спартыўныя палацы з'явіліся ў Чэлябінску, Днепрапятроўску, Валгаградзе і Вільнюсе.

Папулярнасцю арэна стала карыстацца адразу, за першыя 20 гадоў у мінскім Палацы спорту адбыліся найбуйнейшыя рэспубліканскія спаборніцтвы, саюзныя чэмпіянаты і міжнародныя турніры па барацьбе, фехтаванні, боксе, цяжкай атлетыцы, спартыўнай і мастацкай гімнастыцы. Тут праводзілі свае матчы ў саюзных чэмпіянатах хакейны клуб «Дынама» і гандбольны СКА.

За 50 гадоў на гэтай арэне запалілася далёка не адна сусветная спартыўная «зорка». Напрыклад, у пачатку 70-х на чэмпіянаце Еўропы па спартыўнай гімнастыцы, які праходзіў у Мінску, бліскала наша Тамара Лазаковіч. Вольга Корбут, дарэчы, тады таксама была ў Мінску, але толькі ў якасці запаснай у камандзе СССР. На юніёрскім чэмпіянаце Еўропы па хакеі на лёдзе мінскага Палаца спорту гуляў сённяшні галоўны трэнер зборнай Расіі па хакеі, а тады яшчэ юны Алег Знарок. З юніёрскага хакея тут пачыналася кар'ера такіх зорак, як Яўгена Малкіна і Аляксандра Радулава.

Акрамя спартыўных мерапрыемстваў у Палацы праводзіліся і праводзяцца канцэрты, выстаўкі і іншыя культурна-масавыя мерапрыемствы. У яго сценах пабывалі такія вядомыя прадстаўнікі шоу-бізнесу, як Энрыке Іглесіяс, Ванэса Мэй, Наталля Арэйра, Ала Пугачова і іншыя.

Не дзіўна, што на пачатку 2000-х Палац ужо меў патрэбу ў абнаўленні, таму была праведзена паэтапная рэканструкцыя: абноўлены фасады будынка, заменены халадзільнае, светлавое і гукавое абсталяванні, усталявана сістэма кандыцыянавання паветра, заменены сядзенні для гледачоў, устаноўлена новае электронна-інфармацыйнае табло.

Сёння ў гэтым шматфункцыянальным комплексе могуць праходзіць спаборніцтвы па 22 відах спорту, а таксама канцэрты і іншыя відовішчныя мерапрыемствы.

На фоне буйных сучасных спартыўных збудаванняў 50-гадовы Палац спорту не згубіўся, пра гэта сведчыць яго запатрабаванасць. За першыя дзевяць месяцаў гэтага года комплекс прыняў 20 спартыўных турніраў рознага ўзроўню. У іх ліку чэмпіянат свету па тайскім боксе і паўэрліфтынгу, Кубак Еўропы па дзюдо, этап Кубка свету па скачках на батуце. Дзякуючы сваёй шматфункцыянальнасці перыядычна на працягу года ён ператвараўся ў лядовую пляцоўку, дзе праходзілі матчы чэмпіянату краіны па хакеі.



Таму не дзіўна, што аб'ект увайшоў у спіс палацаў, якія прымуць спаборніцтвы II Еўрапейскіх гульняў. Плануецца, што тут пройдуць турніры па самба, грэка-рымскай, вольнай і жаночай барацьбе.

Чакаецца, што да Еўрагульняў Палац спорту яшчэ трохі зменіцца ў лепшы бок, хоць капітальны рамонт праводзіцца там штогод, а сур'ёзных паломак наогул ніколі не было. Да 2019 года планецца закупіць табло памерам 12,5 м на 7 м, якое будзе складацца з чатырох частак. На ім будуць паказваць паўторы спаборніцтваў і рэкламу (цяпер у Палацы спорту ўжо ёсць адно мультымедыйнае гульнявое табло), таксама ў планах набыць гукавы пульт, які зробіць спаборніцтвы яшчэ больш яркімі, гучнымі і зручнымі для гледачоў ■

Матэрыялы падрыхтавала
Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ. lobazhevich@zviazda.by